УДК 808.26(053)

В.І. Рагаўцоў (Магілёў, Беларусь)

ІРАНІЗМЫ Ў П'ЕСАХ МІХАЙЛЫ ГРАМЫКІ

The article deals with irony as the means of creating a comic effect in Mikhaila Hramyka's plays "Zmitrok from High Buda", "Wine Storms", "The Wolf", "Near the Terrace", "Over the Neman". Actualizers, i.e. pre- and postpositional replies, either their fragments or special remarks like 'ironically', serve to identify the comic effect of language units.

М. Грамыка – аўтар шэрагу п'ес, у якіх пры стварэнні камічных сцэн важную ролю адыгрываюць іранізмы – моўныя адзінкі, што ў кантэксце выражаюць тонкую, прыхаваную насмешку. Іранічная канатацыя моўных адзінак выяўляецца з дапамогай вербальных актуалізатараў – рэплік персанажаў або іх фрагментаў ці спецыялізаваных рэмарак.

І. "Змітрок з Высокай Буды". П'еса напісана ў 1918 г. Як адзначае С.С. Лаўшук, яна "была творам наватарскім", "адкрывала новыя вобразы, пашырала жанравыя абсягі і тэматычныя далягляды" [2, с. 106].

1) [Цыганок:] ***Скародзіць*** *твой Змітрок, а толькі* ***не тое раллё.*** *Я зноў спаткаў яго спазаранку ды зноў з той* ***недаткнёнай.*** *Ды ты не хапайся за сэрца, а лепш памяркуем, як гэта дзела парашыць.* Пра ўжыванне *недаткнёнай* як іранізма сведчыць разгорнутая метафара-іранізм *скародзіць не тое раллё* ('уступае ў інтымныя зносіны').

2) [Трэці:] *Пан, ён сапраўды нядрэнны чалавек, а толькі...* [Цыганок:] *Ён ласкавы цяпер і добры!* [Першы:] *Ці ён цябе калі скрыўдзіў?* [Цыганок:] *Ну і* ***цалуйся*** *з імі! Па мне, каб яны ўсе паздыхалі!* Як іранізм ужыты дзеяслоў *цалуйся* (актуалізатар іранічнага ўжывання – *Па мне, каб яны ўсе паздыхалі!*).

ІІ. "Віно бушуе". П'еса сведчыць пра камедыяграфічныя здольнасці М. Грамыкі: "багата насычана вясёлымі пасажамі, нечаканымі сюжэтнымі паваротамі і г. д." [1, с. 13], "вызначаецца жывасцю дыялогаў, імклівасцю дзеі, вастрынёй канфлікту" [3, с. 87].

1) [Сцяпан:] *Дзіўна толькі, што* ***адна слаўная дзяўчына*** *не з намі, Іван Іванавіч, што? Ха-ха-ха!* [Галёнка:] *Вы намякаеце на Прасінскую...* [Сцяпан:] *Волечку...* [Галёнка:] *Вы болей зацікаўлены ў* ***сей*** *асобе, таварыш Гаўрылік, наколькі я змог заўважыць...* З іранічным падтэкстам вымаўляецца Сцяпанам вылучанае словазлучэнне (актуалізатар –трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха!* Не застаецца "ў даўгу" і асістэнт Галёнка Іван Іванавіч, які не без іроніі імкнецца падкрэсліць, што менавіта студэнт Сцяпан Гаўрылік больш зацікаўлены (у) *сей* (асобе). Састарэлы рускамоўны займеннік *сей* ('гэтай') мае адценне ўзвышанасці, што ў дадзеным экспрэсіўна нейтральным кантэксце ўспрымаецца з іранічным адценнем.

2) [Другая:] *Пойдзем туды, там скокі, цікава.* [Адна:] *Там і* ***Вольга Прасінская****, ха-ха-ха!* [Галёнка:] *Для мяне ўсе роўныя.* [Адна:] *Ну? Не верым, Іван Іванавіч!* (Цягнуць яго ў лес.) Паказчыкам іранічнага ўжывання вылучанага спалучэння (састаўнога антрапоніма) з'яўляецца трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха.*

ІІІ. "Воўк". П'еса напісана ў 1930 г., сцэнічнага ўвасаблення не атрымала. Паводле С.С. Лаўшука, найбольшую цікавасць яна выклікае "сваім прыгодніцкім, займальным ладам", а таксама тым, што "досыць пазнаваўчая" [1, с. 13].

1) [Ляксей:] *Тут, недалечка, нашым суседам быў, га?* ***Добры сусед,*** *што? Каб яму дабра не было!* Як іранізм ужыта вылучанае спалучэнне (актуалізатар – праклён *Каб яму дабра не было!*).

2) [Яська:] *Я працую не горай за іншых, механік кажа...* [Цыбульскі:] *Механік...* ***Палюбіўся*** *Гайковічу... Ха-ха! Ну, добра, паглядзім, што далей будзе...* З іранічным значэннем ужываецца Цыбульскім дзеяслоў *палюбіўся* (паказчык – постпазіцыйны вербальны кантэкст *ха-ха! Ну, добра, паглядзім, што далей будзе...*).

3) [Сымон:] *Ну, што ж, нічога! Абодва вольныя – хлапец і дзяўчына, толькі і бяды. А табе ажаніцца час, Яська, гэта праўда.* [Яська:] *Ды не, тата, я* ***толькі...*** [Сымон:] *Пакуль што* ***"толькі"****, ды каб не было болей чаго, чуеш? Каб не было* ***"гэтулькі"****.* З твора вядома, што Яська сустракаецца з Кацярынай. Бацька, ведаючы гэта, звяртаецца да сына: *А табе ажаніцца час, Яська, гэта праўда.* Пачуўшы ад яго: *Ды не, тата, я толькі...* [трэба разумець: *заляцаюся*], Сымон па-бацькоўску шчыра папярэджвае Яську: *Каб не было* ***"гэтулькі"*** (*каб не было болей*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чаго). Тонкі іранічны намёк "хаваецца" за ўжытым у Сымонавай рэпліцы *гэтулькі*, якое абыгрываецца з блізкагучным папярэдне ўжытым *толькі* 'не больш як' (сустракаюся) і набывае ў кантэксце значэнне 'так многа праблем, клопатаў'.

4) [Кацярына:] *Яська пасмялеў, ведаеце, дзяўчаткі. Такі стаў, спрытней за якога іншага з хлопцаў!* [Наста:] *Ці не ты яго, Кацярына,* ***спрытным*** *зрабіла, ды калі ж гэта паспела?* [Дзяўчына адна:] *Кацярынку мы пакінулі з ім ўдвох, дык, мусіць, яна...* Пра іранічнае ўжыванне прыметніка *спрытным* сведчыць рэпліца трэцяга персанажа – адной з дзяўчынак.

5) [Броня:] *Во дзе спаткацца давялося. Нездарма кажуць, што турма –* ***царскі ўніверсітэт.*** [Яська:] *Уцяку з гэтага* ***ўніверсітэта...*** У функцыі камічнага ўжываецца перыфраза-іранізм *царскі ўніверсітэт* (турма), (з гэтага) *універсітэта*.

Насычаны камічны эфект дасягаецца ўжываннем у рэпліках персанажа некалькіх іранізмаў:

1) [Цыбульскі:] *Тры гады ў турме... па зямельнаму дзелу судзілі яго...* [Станавы:] *Стойце, стойце, а фамілія?* [Цыбульскі:] *Мікула, Яська Мікула з Дубраўлян.* [Станавы:] *Та-та-та!* ***Стары прыяцель!*** *Го-го! Так я ж его* ***атлічна*** *знаю!..* [Цыбульскі:] *Ах так, Іван Сцяпанавіч...* [Станавы:] *Ну, я ж яго арэстовывал... О, эта* ***гусь харошый...*** Іранізмы *стары прыяцель* (актуалізатар іранічнай канатацыі – трыплікаваны выклічнік *та-та-та!*, ужыты ў функцыі выклічнікавых фразеалагізмаў-сінонімаў тыпу *вось дык так!; вось дык штука!; вось табе і на!* – 'вокліч здзіўлення з-за чаго-н. нечаканага'), *атлічна* (знаю), *гусь харошый* (паказчыкі іранічнага ўжывання – адпаведна выклічнік-рэдуплікат *го-го!* і фрагмент рэплікі *я ж яго арэстовывал...*).

2) [Яська (зноў напявае):] *На волі пакінуў я родных сваіх...* [Надзірацель:] *Іш, распелась,* ***пцічка!*** *Да* ***клетачка хараша!*** *Каторы тут Яська Мікула?* Для стварэння камічнага эфекту выкарыстаны іранізмы *пцічка* (літ. *птушка*) 'свабодны, ні ад кога не залежны чалавек' (актуалізатар іранічнай канатацыі – *іш, распелась...*), *клетачка хараша* (маецца на ўвазе турэмная камера).

IV. "Каля тэрасы". Драма прысвечана 10-й гадавіне Вялікага Кастрычніка. Паводле А.А. Семяновіча, яна з'яўляецца "найбольш значнай п'есай М. Грамыкі" [4, с. 62].

1) [Генадзь:] *Я быў у лесе, тата. Там поўны парадак.* [Мікола (іранічна):] *Там цішыня, чырвонае лісце!*; [Іона (падыходзіць да тэрасы):] *Іду і чую: "кроў, кроў"! Сказана ў святым пісанні: "Пійце ад ея усі, бо сія есць кроў мая новага завета, за вас ізліваемая!"* [Мікола (іранічна):] *Тут, бацюшка, пра іншую кроў была гаворка, пра зямную.* Рэмарка *іранічна* сведчыць, што Мікола з насмешкай успрымае словы Генадзя і айца Іона. Гэта пацвярджаецца, дарэчы, і ягонымі рэплікамі.

2) [Таццяна:] *Зараз рэвалюцыя... пачынаецца...* [Мікола:] *Можа, канчаецца?* [Таццяна:] *Пачынаецца!* [Мікола:] *Ой-ой! Якія ўсе дзяўчаты зрабіліся* ***разумныя*** *палітычна!* Выклічнік-рэдуплікат *ой-ой!* разам з займеннікавым словам *якія* не толькі ўзмацняюць значэнне прыметніка *разумныя* (палітычна), але і ўтрымліваюць іранічную ацэнку разумовых здольнасцей Таццяны – дачкі садоўніка Барановічаў і такіх, як яна.

3) [Мікола (азіраючыся на тэрасу):] *Цішэй нельга, пан паручнік? Ды і глупства вы гаворыце!* [Афіцэр (пакрыўджана):] *Как это "глупства"? А кто со мной говорил?* [Мікола:] *Піце кахецінскае і маўчыце!* [Афіцэр:] *Мадам! Меня оскорбили! Я же мужчина* ***с головы до ног!*** Камічны эфект грунтуецца на сумяшчэнні несумяшчальнага: з аднаго боку, афіцэр лічыць сябе мужчынам *с головы до ног!* (бел. фразеалагізм *з галавы да ног* – разм. 'з усіх бакоў; поўнасцю, цалкам'), а з другога боку – яго, мужчыну-"гаротніка", раптам зняважылі (пакрыўдзілі).

Інтэнсіфікацыі іранічнага эфекту садзейнічае канцэнтраванае ўжыванне сінтаксічных аказіяналізмаў: [Сысой:] *Дзень добры,* ***пане капітан!*** [Мікола:] *Добры дзень,* ***пане ніжні чын.*** [Сысой (не заўважае іроніі):] *Мая пляменніца Таццяна тут у вас у фальварку працуе?* Іранічны эфект дасягаецца ўжываннем сінтаксічных аказіяналізмаў – звароткаў *пане капітан* і *пане ніжні чын*: як вядома, *пане* (клічная форма назоўніка *пан*) нарматыўна не спалучаецца з *капітан* ('самае высокае званне малодшага афіцэра') і прафесійным выразам *ніжні чын* ('салдат у царскай арміі ў адрозненне ад афіцэраў'). Рэмарка (не заўважае) *іроніі* сведчыць пра тое, што папярэдні выраз Мікола ўжыў як іранізм.

З канцэнтраваным ужываннем іранізмаў сустракаемся і ў наступным прыкладзе: ["Ударнік":] *Пагражаеце,* ***"таварыш"*** [матрос Барыка]***?*** *Можа, зноў збіраецеся* ***"выступіць"?*** *Здорава вас тады, у ліпені, лупцавалі! Ды хто – юнкеры ды дзве сотні казакаў! Ды ці не там і вас* ***пачаставалі?*** *Я чуў, нібы паранены?* Тут ужыты іранізмы *таварыш*, *выступіць* (графічны паказчык іранічнай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інтанацыі – двукоссе), *пачаставалі* – перан. разм. ‘пабілі за тое, што лезлі не ў сваё’ (актуалізатар значэння – фрагмент прэпазіцыйнай рэплікі *Здорава вас тады, у ліпені, лупцавалі!*).

V. “Над Нёманам”. Драма напісана ў 1926 г. Для таго часу п’еса была вельмі наддзённай: у ёй апавядаецца пра жыццё і барацьбу працоўных Заходняй Беларусі з пануючымі класамі буржуазна-памешчыцкай Польшчы за свае сацыяльна-палітычныя і нацыянальныя правы [4, с. 62].

1) [Алена:] (Выходзіць з хаты. Да Стася.) ***Слаўны*** *ты хлапчына, лепш за іншага языкастага.* (Стась смяецца.) Іранічнае значэнне прыметніка *слаўны* выяўляецца з дапамогай актуалізатара *лепш за іншага языкастага.*

2) [Бжэзіцкі:] *Барацьба?.. Так… барацьба рэальна, на вялікі жаль. Яна ёсць, так! Тым патрэбней нам, вайсковым, быць збоку яе!* [Ржэвуцкі:] *Быць пасіўным? Значыць не мець волі, а пан палкоўнік сказаў, што мы –* ***сама воля нацыі?*** [Бжэзіцкі:] *Проша без іроніі і сафізмаў, паручнік!* Выраз *сама воля нацыі* (з рэплікі Ржэвуцкага) Бжэзіцкі ўспрымае як іранізм (актуалізатар *Проша без іроніі*).

3) [Бжэзіцкі:] *А калі і сам прынясеш таварышу? Час наш* ***дэмакратычны****… А? Ха-ха-ха!* (54) Вылучаны прыметнік ужываецца Бжэзіцкім як іранізм (паказчык – трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха!*).

4) [Шэцкі:] *Мне здаецца, што* ***галоўная заслуга*** *старога графа ў тым, што ён ужо не можа скрыўдзіць ніводнае з такіх пякнотачак…* (Да балерын.) *Так! Ха-ха-ха! Музыка, грай!* Іранічнае значэнне словазлучэння *галоўная заслуга* выяўляецца з дапамогай постпазіцыйных актуалізатараў – *ён ужо не можа скрыўдзіць ніводнае з такіх пякнотачак* [балерын]… і трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха!*

З іранічнай канатацыяй могуць ужывацца формулы маўленчага этыкету, у аснове якіх – прыём алагізму: [Шэцкі:] *Ты* [Ржэвуцкі] *нервуешся болей, як я! Ну, што ж! Вайну, нам? Добра, прымаем! Мускулы ў нас яшчэ нішто,* ***пане хлопе!*** *Ха-ха-ха!* Ведаючы, што афіцэр Ржэвуцкі з сялян, прыгонны, граф Шэцкі, які мае чын афіцэра, ужывае ў дачыненні да яго форму звароту *пане хлопе*, дзе у адно цэлае аб’ядноўваюцца несумяшчальныя паняцці *пан* – ‘чалавек з прывілеяваных класаў (у дарэвалюцыйнай Расіі)’ і *хлоп* (польск. *chłop* – ‘селянін’) – бел. *халоп* ‘прыгонны селянін’.

У п’есе сустракаемся са слосна-з’едлівай іроніяй – сарказамам:

1) [Алена:] *Скончыла з ёю нашу школу ў Міры, а пасля ў Вільні два гады вучылася ў гімназіі.* [Тэксля:] *Вядома, у* ***беларускай?*** *Ха-ха-ха!* Так, з сарказмам адрэагавала дачка асадніка Тэкля, якая з пагардаю ставілася да беларускай мовы, даведаўшыся ад Алены, што яна вучылася ў беларускай гімназіі.

2) [Шэцкі:] *Усё ж я дагнаў вас! Узяў камандзіроўку спецыяльна.* (Алена адвярнулася, маўчыць.) *Ну, што, панна леснічанка? Як і раней,* ***хочаце прынесці сваю дзявочую чыстасць на алтар рэвалюцыі?*** *Ха-ха-ха!* Трыплікаваны выклічнік *ха-ха-ха!* – паказчык іранічнага ўжывання Шэцкім вылучаных слоў.

3) *“Калі двое жандараў звязалі Ржэвуцкаму рукі, Тэкля, падбегшы да яго, з едкай іроніяй прамовіла: “****Не ўцячэ і твая каханка.*** *Ха-ха-ха!”* Вылучаны выраз мае саркастычную афарбоўку, пра што сведчыць фрагмент рэплікі *з едкай іроніяй* (прамовіла). Трыплікаваны выклічнік *Ха-ха-ха!* тут выконвае дзве функцыі: саркастычную і актуалізацыйную (паказчык іранічнай канатацыі папярэдняга выразу).

З саркастычнай афарбоўкай вымаўляецца адметная разнавіднасць лексічнага паўтору – мімезіс: [Косця:] *Што вы, татка, дапраўды! Муцілі, муцілі… А як жа не маўчаць? Каб не хлопцы нашыя, што там крыкнуць, там прыгрозяць, дык бы…* [Мацей:] *Што* ***“дык”, “дык бы”****… Лепш працавалі б, як па лесе бадзяцца!..*

Часам у адной рэпліцы могуць спалучацца “чыстая” іронія і сарказм: [Тэкля:] ***Каханкі!*** [пра Ржэвуцкага і Алену] *Ха-ха-ха! Здраднік, хлоп!.. Не, Польска яшчэ не згіне праз такіх! За вочы хлопскай дзяўчыны…* ***беларусінкі…*** *ха-ха-ха! Зганьбіць свой мундзір!* Тут *каханкі* – іранізм (паказчык – *ха-ха-ха!*), (за вочы хлопскай дзяўчыны…) *беларусінкі* – іранізм са з’едлівай насмешкай (актуалізатар – *ха-ха-ха! Зганьбіць свой мундзір!*).

Такім чынам, актуалізатарамі іранічнага ўжывання моўных адзінак з’яўляюцца як спецыялізаваныя вербальныя сродкі (рэмарка *іранічна*), так і неспецыялізаваныя (прэпазіцыйныя, інпазіцыйныя і постпазіцыйныя рэплікі персанажаў або іх фрагменты ці сітуацыйны кантэкст).

Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Лаўшук, С.* Усё гэта трэба нам / С. Лаўшук // Родная пушча : п’есы, вершы, паэмы, успаміны, лісты / М. Грамыка; уклад. С.П. Шушкевіч ; аўтар прадм. С.С. Лаўшук. – Мінск : Маст. літ., 1987. – С. 3 – 14.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. *Лаўшук, С.С.* Гарызонты беларускай драматургіі / С.С. Лаўшук. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 412 с.
3. *Лаўшук, С.С.* Літаратура перыяду грамадзянскай вайны і 20-х гг. [драматургія] / С.С. Лаўшук // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры : [вуч. дапаможнік для філал. фак. ун-ў / С.А. Андраюк, М.М. Барсток, Д.Я. Бугаёў і інш.] ; пад рэд. І.Я. Навуменкі і інш. – Мінск : Выш. шк., 1981. – Ч. 1. – С. 81 – 91.
4. *Семяновіч, А.А.* Міхайла Грамыка / А.А. Семяновіч // Гісторыя беларускай савецкай драматургіі : 1917 – 1955 гады : вучэб. дапам. / А.А. Семяновіч. – Мінск : Выш. шк., 1990. – С. 60 – 67.

библиотеки МГУ и